# Палітычнае становішча Беларусі ў XVI — першай палове XVII стагоддзяў

**Абагульняльны ўрок-гульня па гісторыі Беларусі, VIII клас**

**Н. І. Палуяновіч**, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства
Велікагацкай СШ Івацэвіцкага раёна

**Мэты:** стварыць умовы для замацавання атрыманых ведаў па тэме; арганізаваць сітуацыю для развіцця лагічнага мыслення, пазнавальнай актыўнасці; спрыяць выхаванню павагі да гістарычнай спадчыны, любові да Радзімы.

**Абсталяванне:** карта ўражанняў з кветачкамі; гістарычная карта; выстава партрэтаў гістарычных асоб; карткі-заданні з іх апісаннем; тэст і карткі з нумарамі 1, 2, 3; плакат «Гістарычны слоўнік»; карткі з заданнем «Гістарычная падзея»; магнітафон з запісамі музыкі для фізкультмінуткі; фішкі для ацэнкі адказаў.

## Ход урока

***I. Арганізацыйны момант.***

На карце эмоцый, якая змяшчае незвычайныя назвы краін, астравоў, гарадоў, мораў і г. д. (возера Надзеі, мыс Поспеху, востраў Цудаў, краіна Ведаў, мора Хвалявання, рака Эмоцый і іншыя па прапанове вучняў), вучні размяшчаюць свае кветачкі адпаведна настрою ў пачатку ўрока.

***II. Актуалізацыя ведаў.***

На папярэднім уроку клас быў падзелены на дзве каманды. Ім было прапанавана падабраць назву і дэвіз, прыдумаць эмблему.

Гістарычная гульня пачынаецца з прывітання каманд.

1. Заданне «Гістарычнае лато».

На дошцы вывешваецца плакат з пералікам слоў гістарычнага слоўніка, кожнае з якіх мае асабісты нумар. Усе члены каманды па чарзе дастаюць бочачку лато з нумарам і тлумачаць гістарычны тэрмін адпаведна нумарам.

За правільны адказ вучань атрымлівае фішку.

<u>Прыклад афармлення плаката</u>

**Гістарычны слоўнік**

| | |
|---|---|
| 1. ВАЯВОДСТВА | 12. УНІЯ |
| 2. ПАВЕТ | 13. ФЕДЭРАЦЫЯ |
| 3. РАДА | 14. ГАЛОЎНЫ ТРЫБУНАЛ |
| 4. СТАТУТ | 15. СЕНАТ |
| 5. СОЙМ | 16. ІНТЭРВЕНЦЫЯ |
| 6. ВОЙТ | 17. АЛЬЯНС |
| 7. ЖАЎНЕР | 18. БРАЦТВА |
| 8. СТАРАСТА | 19. ПРЫВІЛЕЙ |
| 9. ПАСПАЛІТАЕ РУШАННЕ | 20. ШЛЯХТА |
| 10. АРДЫНШЧЫНА | 21. КАНФЕДЭРАЦЫЯ |
| 11. МАГНАТ | 22. ПАЗІЦЫЙНАЯ ВАЙНА |

2. Заданне «Гістарычны партрэт».

На стале настаўніка раскладзены заданні ў канвертах з апісаннем пэўнай гістарычнай асобы, на дошцы вывешаны партрэты гістарычных асоб. Капітаны па чарзе дастаюць заданні і зачытваюць іх сваёй камандзе. Калі яна не дае адказ, то права на яго пераходзіць да другой каманды.

**Гістарычныя асобы**

1. Прадстаўнік знакамітага княжацкага роду. Маладыя гады правёў у Еўропе, дзе служыў у саксонскага курфюрста Альбрэхта. Потым перайшоў на службу да імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Максіміліяна І. Ваяваў у Італіі, дзе вызначыўся ваенным талентам і смеласцю. Удзячны імператар надаў свайму ўлюбёнцу тытул князя Свяшчэннай Рымскай імперыі. Пасля 12-гадовай службы ў Еўропе князь вярнуўся на радзіму, дзе доўгі час быў першай асобай у княстве. Аднак у 1508 г., страціўшы ўплывовасць пры двары, арганізуе мяцеж супраць існуючай улады. *(Міхал Глінскі.)*

2. Прадстаўнік старажытнага роду тураўскіх князёў. Прысвяціў жыццё служэнню Айчыне. Вызначаўся цвёрдасцю характару, адданасцю веры продкаў — праваслаўю. Быў найбольш вядомы ратнымі подзвігамі, а таксама мецэнацкай дзейнасцю: закладваў манастыры, цэрквы, школы, падтрымліваў кнігапісанне. Уваходзіў у палітычную эліту ВКЛ: займаў пасады найвышэйшага гетмана і трокскага ваяводы. *(Канстанцін Астрожскі.)*

3. Вядомы палітычны і грамадскі дзеяч ВКЛ, адзін з самых знакамітых і таленавітых прадстаўнікоў роду. Прызначаўся на пасады пісара дзяржаўнай канцылярыі, падканцлера, канцлера, віленскага ваяводы, гетмана ВКЛ. Займаючы вышэйшыя дзяржаўныя пасады, праявіў сябе як выдатны дыпламат, дасведчаны

gisdapamoga.by
gisdapamoga.by

прававед, мудры дзяржаўны муж. Усе свае веды (а меў ён заходнюю ўніверсітэцкую адукацыю), таленты, багацце клаў на служэнне Айчыне — ВКЛ. *(Леў Сапега.)*

4. Увайшоў у гісторыю Беларусі, Польшчы, Літвы як адзін з самых моцных і дзейсных каралёў Рэчы Паспалітай. Сын трансільванскага, ці, як казалі ў XVI ст., сяміградскага ваяводы. У красавіку 1576 г. каранаваўся ў Кракаве, а крыху пазней шляхтай ВКЛ быў прызнаны вялікім князем. Вядомы як выдатны палкаводзец, рэфарматар, тонкі дыпламат і мецэнат навукі. Улюбёным яго горадам і рэзідэнцыяй была Гародня, дзе ён дачасна сышоў з жыцця. *(Стэфан Баторый.)*

5. Дробны шляхціц з Полаччыны, які ўзняўся да вышынь разумення чалавечай існасці. Свае погляды ён выказваў у прадмове да перакладу Евангелля. Палымяныя словы пісьменніка былі сказаны ў абарону роднай мовы, гісторыі, традыцый. Выступаў за пашырэнне асветы сярод люду простага, выказваўся за маральную чысціню чалавека. *(Васіль Цяпінскі.)*

6. Пяты сын Казіміра IV Ягелончыка. 12 кастрычніка 1506 г. стаў вялікім князем літоўскім, а 9 снежня — каралём польскім. Яго лічылі разумным, разважлівым, памяркоўным кіраўніком Польшчы і ВКЛ. Па натуры не ваяўнічы, апекаваў навукі, мецэнат. Меў значную бібліятэку, запрашаў да сябе вядомых скульптараў, архітэктараў, жывапісцаў. Яго подпісам пазначаны дзве ахоўныя граматы для ўсходнеславянскага першадрукара Францыска Скарыны. *(Жыгімонт І Стары.)*

За правільны адказ на пытанне і паказ гістарычнага партрэта даюцца дзве фішкі, калі каманда ведае толькі адказ на пытанне — адна фішка.

3. Заданне «Гістарычны пошук».

Кожнай камандзе даецца картка-заданне, дзе трэба злучыць дату з той падзеяй, якой яна адпавядае. За кожнае правільнае злучэнне даецца адна фішка.

Прыклад задання

1529 г. пачатак Лівонскай вайны
1566 г. прыняцце першага Статута ВКЛ
1558 г. заключэнне Берасцейскай царкоўнай уніі
1596 г. прыняцце другога Статута ВКЛ
1557 г. праведзена рэформа «Устава на валокі»

***Фізкультхвілінка.***

4. Заданне «Гістарычны тэст».

У кожнага вучня асабістыя карткі з лічбамі 1, 2, 3. Настаўнік зачытвае заданне і тры адказы да яго. Вучні павінны падняць карткі з правільным адказам.

**Тэст**

• Малады нашчадак трона Рэчы Паспалітай Жыгімонт II Аўгуст закахаўся ў нясвіжскую прыгажуню, якая, нягледзячы на ўсе перашкоды з боку бацькоў і вяльмож, стала яго жонкай. Яе імя:
1. Бона Сфорца.
2. Барбара Радзівіл.
3. Алена Глінская.

• Паланізацыя беларускай шляхты адбывалася праз:
1. Далучэнне да польскай мовы і культуры.
2. Насаджэнне каталіцызму.
3. Далучэнне да «залатых польскіх шляхецкіх вольнасцей».

• Рэч Паспалітая — шматэтнічная дзяржава, у яе ўваходзілі:
1. Палякі і літвіны.
2. Палякі і ўкраінцы.
3. Беларусы, літоўцы, украінцы.

• Пасля нечаканай смерці Стэфана Баторыя польская шляхта стала перад цяжкім пытаннем выбару новага караля. Гэта:
1. Рускі цар Фёдар Іванавіч.
2. Шведскі каралевіч Жыгімонт Ваза.
3. Аўстрыйскі эрцгерцаг Максіміліян.

• У Рэчы Паспалітай утварылася пэўная катэгорыя насельніцтва, якая стала называцца «народ шляхецкі». Яна складалася з:
1. Польскай шляхты і гарадскіх нізоў.
2. Велікакняжацкай шляхты і сялян.
3. Польскай і велікакняжацкай шляхты.

За правільны адказ на кожнае з пытанняў вучань атрымлівае адну фішку.

5. Заданне «Гістарычнае падарожжа» (конкурс капітанаў).

Кожны капітан дастае з канверта заданне (ён павінен адказаць на пытанне і паказаць на карце свой адказ). Калі капітан не спраўляецца, дапамагае каманда. Калі не спраўляецца каманда, то права адказу пераходзіць да каманды саперніка.

**Пытанні**

1. Моцнае вялікае княства паўстала з невялічкага ўдзелу-вотчыны, далучаючы да сябе суседнія, былыя незалежныя ўдзелы-княствы. Яно прыпісвала сабе ролю спадкаемцы Кіева, Візантыі і галавы ўсіх праваслаўных хрысціян Усходняй Еўропы. Пра якое княства ідзе размова? *(Вялікае княства Маскоўскае.)*

2. Яна сама дамагалася ўніі з ВКЛ. Пэўнаму колу шляхты гэтай краіны ВКЛ мроілася ў якасці багатага прыдатку, шляхта

gisdapamoga.by

сквапна пазірала на ўсходнія землі. Там яна збіралася набыць новыя багацці, пасады, узнагароды. Пра якую краіну ідзе гутарка? *(Пра Польшчу.)*

3. Міхалон Ліцвін доўгі час вандраваў па Беларусі. Ён адзначыў: «У рэках тут мноства асятроў і іншых вялікіх рыб. Па гэтай прычыне многія рэкі называюцца залатымі, асабліва...». Пра якую раку ідзе размова? *(Пра Прыпяць.)*

4. У 1613 г. у дадатку да карты Беларусі і Літвы яе складальнік Г. Макоўскі адзначаў: «ВКЛ — найвялізнейшая і найбагацейшая краіна з рыбнымі сажалкамі і азёрамі, вялікімі і славутымі рэкамі, з якіх судаходнай з'яўляецца Хранон...». Якая сучасная рака насіла назву Хранон? *(Нёман.)*

5. Напачатку зімы 1563 г. вялікія сілы рускіх ратнікаў рушылі на аблогу гэтага старажытнага беларускага горада. На чале іх стаяў сам Іван IV Грозны. 31 студзеня горад трапіў у аблогу. Пра які горад ідзе гутарка? *(Пра Полацк.)*

6. У XVI ст. войска ВКЛ славілася сваёй артылерыяй. Многія гарматы былі непаўторныя і мелі свае назвы — «Салавейкі», «Спявачкі» і іншыя. Тут была адліта і цудоўная «Гідра», якая мела форму калоны грэчаскага стылю. У якім горадзе яе адлілі? *(У Нясвіжы.)*

7. Асабліва значную перамогу над татарамі войска ВКЛ здабыло ў 1506 г. Летам 30-тысячнае войска крымчакоў уварвалася на Беларусь. Супраць рабаўнікоў выйшла войска на чале з М. Глінскім і ўшчэнт разбіла праціўніка. У якім месцы гэта адбылося? *(На рацэ Лань пад Клецкам. Красны Стаў.)*

8. 8 верасня 1514 г. войска ВКЛ на чале з К. Астрожскім уступіла ў сутычку з войскамі княства Маскоўскага, якія пераўзыходзілі літвінаў у сіле амаль утрая. Але войска ВКЛ атрымала вельмі значную для нас перамогу. Дзе адбылася гэта бітва? *(На рацэ Крапіўна пад Оршай.)*

За правільны адказ вучань атрымлівае дзве фішкі, калі адказ утрымлівае толькі пытанне, то адну фішку.

***III. Падвядзенне вынікаў урока.***

1. Падлічваюцца асабістыя фішкі кожнага вучня для ацэнкі ведаў. Вызначаецца пераможца.

2. Падлічваюцца вынікі работы каманд, вызначаецца пераможца. Кожны вучань каманды-пераможніцы атрымлівае дадатковы бал пры выстаўленні адзнак.

***IV. Рэфлексія.***

На карце эмоцый вучні адзначаюць свой настрой кветачкай.

***V. Дамашняе заданне.*** Падрыхтуйце паведамленне пра найбольш яскравую падзею, якая вас уразіла падчас вывучэння тэмы.

gisdapamoga.by

# Социальная ориентация личности

**Обществоведение, X класс**

**И. С. Макаревич,** учитель истории и обществоведения СШ № 1 г. Ивацевичи

В то время как сердце наше заполнено мыслями о маленькой группе нескольких «Я», близких и дорогих нам, что же остаётся в нашей душе для остального человечества?

**Е. П. Блаватская**

**Задачи**

1. Раскрыть смысл понятий *альтруизм, эгоизм, конформизм, нонконформизм.*
2. Учить применять названные понятия для оценки поведения людей.
3. Содействовать осознанному выбору и обоснованию собственной линии поведения в различных жизненных условиях.